## «Мы б аддалі, ды ніхто не забірае»

Працоўная кніжка павінна выдавацца работніку асабіста на рукі ў дзень звальнення (Артыкул 50 Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь) (далей – ПК). Але так бывае не заўсёды. Здараецца, што работнік у гэты дзень хварэе ці знаходзіцца ў адпачынку і не можа яе атрымаць. А калі ён не згодны са звальненнем, то і зусім можа адмовіцца забіраць дакумент. У асобных выпадках наймальнік можа панесці адказнасць за затрымку яе выдачы (артыкул 79 ПК). Што рабіць у такой сітуацыі як вярнуць працоўную кніжку звольненаму работніку?

Калі работнік у дзень звальнення адсутнічае (не працуе) на працы, то ў такой сітуацыі наймальнік накіроўвае ў гэты ж дзень работніку заказны ліст з паведамленнем аб неабходнасці з'явіцца за працоўнай кніжкай. Аднак сама кніжка не высылаецца. У лісце наймальнік можа паведаміць работніка, што ён мае права атрымаць працоўную кніжку па пошце, калі аформіць пісьмовую згоду на гэта.

З дня накіравання ліста віны наймальніка ў затрымцы выдачы працоўнай кніжкі не будзе. Калі ж ён накіруе яго пазней ці не накіруе зусім, то парушыць заканадаўства аб працы. І не выключана, што пасля дату звальнення спатрэбіцца змяніць на фактычную дату выдачы працоўнай кніжкі, а за час вымушанага прагулу неабходна будзе выплаціць работніку сярэдні заробак.

Таксама можа паўстаць і такая сітуацыя, калі работнік ухіляецца ад атрымання працоўнай кніжкі.

У дадзеным выпадку, наймальнік павінен, па-першае, аформіць акт (далей – акт) аб адмове работніка ад атрымання працоўнай кніжкі, па-другое, накіраваць работніку заказны ліст з паведамленнем аб неабходнасці яўкі за атрыманнем працоўнай кніжкі.

**Вержынская Таццяна**,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай
інспекцыі працы